■ Армейскі дайджэст

# АФІЦЭРЫ ІДУЦЬ СЛУЖЫЦЬ

**Каля 100 афіцэраў запасу да канца года папоўняць армейскія шэрагі краіны. Адпаведны ўказ падпісаў кіраўнік дзяржавы.**

Ва Узброеныя Сілы будуць прызваны грамадзяне ва ўзросце да 27 гадоў, якія раней не праходзілі ні тэрміновую воінскую службу, ні службу ў рэзерве, не маюць права на адтэрміноўку ад прызыву і па стане здароўя прыгодныя выконваць воінскія абавязкі. Прычым да мерапрыемстваў прызыву прыцягваюцца тыя афіцэры запасу, якія навучаліся на ваенных кафедрах або факультэтах грамадзянскіх ВНУ.

Афіцэры будуць прызначаны на афіцэрскія воінскія пасады, якія адпавядаюць атрыманым імі ваенна-ўліковым спецыяльнасцям. Удасканальваць свае веды ў войску яны будуць на працягу года.

На афіцэраў, якія неўзабаве папоўняць шэрагі Узброеных Сіл, распаўсюджваюцца ўсе прававыя гарантыі, прадугледжаныя заканадаўствам для афіцэрскага складу. У тым ліку гэта тычыцца грашовага і рэчавага забеспячэння, стварэння жыллёвых умоў па месцы праходжання службы або кампенсацыі выдаткаў на жыллё.

Калі па заканчэнні тэрміну службы афіцэры выкажуць жаданне застацца ў войску, у іх з'явіцца магчымасць працягнуць службу на кантрактнай аснове. Тыя, хто да воінскай службы працаваў у дзяржаўных арганізацыях, змогуць вярнуцца на сваё ранейшае працоўнае месца, якое для іх захаваецца.

# ВАЙСКОВАЯ АЛІМПІЯДА

**З 30 ліпеня па 13 жніўня палігоны Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Казахстан стануць пляцоўкамі буйных спаборніцтваў сярод вайскоўцаў. У «Армейскіх міжнародных гульнях — 2016» возьмуць удзел і беларускія ваеннаслужачыя.**

На працягу двух тыдняў нашы вайскоўцы прадэманструюць сваё майстэрства ў 8 конкурсах. Лётныя экіпажы паспаборнічаюць у конкурсе «Авіядартс», танкавыя — у «Танкавым біятлоне». У конкурсе «Дэсантны ўзвод» за пальму першынства пазмагаюцца дэсантнікі, разлікі зенітна-артылерыйскіх і зенітна-ракетных падраздзяленняў падзеляцца сваім вопытам у спаборніцтве «Чыстае неба». Каманды снайперскіх пар і ваенных інжынераў прымуць удзел у этапах «Снайперскі рубеж» і «Бяспечны маршрут» адпаведна. Свае ўменні пакажуць і разлікі зенітна-ракетных войск (конкурс «Ключы ад неба»), спецыялісты службовага сабакаводства (конкурс «Верны сябар»).

Першымі ў Расію адправіліся нашы дэсантнікі. У конкурсе «Дэсантны ўзвод» беларускую каманду прадставіць мабільны ўзвод 38-й асобнай гвардзейскай мабільнай брыгады сіл спецыяльных аперацый. Поспехаў вам, вайскоўцы!

■ З гісторыі маёй сям'і

# Жменька памяці

**У мяне не раз узнікала думка занатаваць успаміны аб сваіх продках. На жаль, мы часта не звяртаем увагі на тых, хто побач. Здаецца, што так будзе вечна. А час бязлітасна забірае блізкіх і дарагіх людзей, з якімі недагаварыў, якіх пра многае не паспеў распытаць, не выслухаў...**

Бабуля майго таты, Валянціна Іванаўна Казлоўская, жыве ў вёсцы Альхоўка, што ў Любанскім раёне. Яе бацька, мой прапрадзед, загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Іван Ліхадзіеўскі нарадзіўся ў 1904 годзе, меў польскія карані. Яго бацькі, Марыя Вячэра і Іосіф Ліхадзіеўскі, былі беззямельнымі палякамі, жылі ў вёсцы Рачэнь. Прапрадзед ажаніўся з Антанінай Гуткоўскай і пераехаў жыць у вёску Альхоўка, дзе сям'я пабудавала дом.

Мае продкі былі шчырымі працаўнікамі: з раніцы да вечара — у полі. У іх нарадзілася чацвёра дзяцей. Самы меншы хлопчык, Вячаслаў, з'явіўся на свет перад самай вайной — у 1939 годзе. У сям'і выхоўваліся таксама тры дачкі. Жылі вельмі сціпла і проста.

Калі пачалася вайна, стала яшчэ цяжэй. Карову, галоўную карміліцу сям'і, забралі мясцовыя ўлады з агаворкай: «Усё для фронту». Нягледзячы на голад, чым маглі, дапамагалі партызанам, якія наведваліся ў вёску. Хлеб пяклі, дабаўляючы ў муку дубовую кару, варылі суп з лебяды і крапівы. Вялікім святам была на стале кулцця, бульба, бліны.

Прапрадзеда Івана забралі ў Чырвоную Армію 22 ліпеня 1944 года, калі Беларусь ужо вызвалілі. Яго дачка памятае, што ў той дзень гаспадар рамантаваў дах у доме. Маці разам з іншымі жанчынамі працавала ў полі. Да двара пад'ехала машына, афіцэр растлумачыў, што ідзе мабілізацыя і Іван павінен зараз жа паехаць з імі. Той толькі і паспеў узяць з хаты пашпарт ды развітацца з дзецьмі. Аб тым, што муж пайшоў на фронт, жонка даведалася толькі вечарам, калі вярнулася дадому з поля.



Іван Іосіфавіч ЛІХАДЗІЕЎСКІ (даваенны фотаздымак).

**У пахавальнай, якую атрымала жонка, было сказана, што Іван Іосіфавіч Ліхадзіеўскі загінуў у баі 28 кастрычніка 1944 года пад Варшавай. Дзе ён пахаваны, дакладна было невядома.**



Форма № 4

Извещение

Ваш ___ (муж, сын, брат, воинское звание)

___ (фамилия, имя и отчество)

Уроженец ___ (область, район село)

в боях за Социалистическую Родину, верный воинской присяге, проявив геройство и мужество был ___ (убит,

___ ранен, умер от ран, пропал без вести)

Похоронен ___

Настоящее извещение является документом для возбуждения ходатайства о пенсии (приказ НКО СССР № 139—43 г.

Любаньский Райвоенком
майор (БАРКОВ).

Пахавальная...

Жанчына сабрала для мужа самае неабходнае, крыху ежы і пешшу накіравалася за 30 кіламетраў, на чыгуначную станцыю ў вёсцы Урэчча, адкуль усіх прызыўнікоў накіроўвалі на фронт. Старэйшая дачка з дапамогай старой бабулькі-суседкі павінна была даглядаць у гэтыя дні малодшых дзяцей. Калі праз чатыры дні маці вярнулася дадому, нечаканая бяда сустрэла на парозе: за дзень да гэтага невядома ад чаго памёр маленькі хлопчык, меншая дачка ляжала непрытомная і хутка памерла таксама. Так у 12 гадоў мая прабабуля стала галоўнай памочніцай сваёй маці. Уся цяжкая праца па гаспадарцы выпадала ёй. Яна завіхалася на агародзе, нарыхтоўвала дровы, гатавала ежу, а зімовымі вечарамі вучылася грамаце.

Іван Ліхадзіеўскі трапіў у 132-ю стралковую дывізію. Ішлі баі за вызваленне Польшчы. Жонка напісала яму пра раптоўную смерць дзяцей. Як потым расказаў аднавясковец, Якуб Бахановіч, з якім разам служыў прапрадзед, ён цяжка перажываў гэту навіну. У той дзень 28 кастрычніка, якраз перад наступленнем, землякі доўга размаўлялі, успамінаючы свае блізкіх, родную вёску. На жаль, гэта размова была апошняй для майго продка... У пахавальнай, якую атрымала жонка, было сказана, што Іван Іосіфавіч Ліхадзіеўскі загінуў у баі 28 кастрычніка 1944 года пад Варшавай. Дзе ён пахаваны, дакладна было невядома.

Мой тата, Аляксандр Казлоўскі, яго праўнук, вырашыў заняцца пошукамі месца, дзе можа быць пахаваны прадзед. Былі накіраваны запыты ў адпаведныя ўстановы і грамадскія арганізацыі. У выніку стала вядома, што Іван Ліхадзіеўскі пахаваны ў польскім горадзе Яблонь. Разам з 300 салдатамі і афіцэрамі Чырвонай Арміі, якія загінулі ў тым баі, ён спачывае ў брацкай магіле.

Спадзяёмся, што гэтым летам наша сям'я наведае месца, дзе пахаваны наш продак і яго адпачне — звычайныя беларускія салдаты, сціплыя працаўнікі. Мы абавязкова пакладзём на брацкую магілу жменьку беларускай зямлі, каб яго душа адчувала, што мы памятаем, ганарымся і застанемся назаўсёды абавязанымі і ўдзячнымі за сіняе мірнае неба і шчаслівае дзяцінства.

**Ганна КАЗЛОЎСКАЯ,**
*г. Салігорск.*

**Фота з архіва сям'і Казлоўскіх**

# СІТУАЦЫЮ, НАБЛІЖАНУЮ ДА ЭКСТРЭМАЛЬНАЙ, СТВАРЫЛІ Ў ЦЭНТРЫ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ



аказваць медыцынскую дапамогу, трэба было спытаць у пацярпелага, ці магу я гэта рабіць, — дадае начальнік аддзела. — Цяпер, у сувязі з апошнімі падзеямі ў свеце, баявому варыянту аказання медыцынскай дапамогі павінны вучыцца ўсе, у тым ліку грамадзянскія службы, якія таксама змагаюцца з наступствамі тэрарыстычных атак».

Быццам нехта націснуў на паўтор — адна за адной каманды сілавых падраздзяленняў на практыцы дэманстравалі свае веды па тактычнай медыцыне, атрыманыя на працягу двухдзённага збору. Праўда, час у кожнага быў розны. Хтосьці спраўляўся з пастаўленай задачай каля 15 хвілін, іншым спатрэбілася напалову менш. У лідарах — тая каманда, якая менш за ўсіх затраціла часу і набрала мінімум штрафных балаў. Лепш за ўсіх з пастаўленай задачай справіліся прадстаўнікі спецыяльнага атрада хуткага рэагавання. Другімі на спаборніцтвах сталі байцы спецыяльнага падраздзялення па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз», трэцімі — атрада міліцыі асаблівага прызначэння Мінска.

За спаборніцтвамі сачылі і эксперты з Расіі. У суседняй краіне тактычнай медыцыне таксама ўдзяляецца вялікая ўвага.

— Такія спаборніцтвы рэдка дзе праводзяць, больш за тое, вы пачалі гэта рабіць першымі: ва ўсялякім разе, сярод постсавецкіх краін, — зазначае **намеснік начальніка медыцынскай службы цэнтра тактычнай медыцыны Навучальнага цэнтра «Віцязь» Дзмітрый УЛЬЯНАЎ (Расійская Федэрацыя).** — Мы таксама спаборніцтваў не праводзім, але наш цэнтр таксама рыхтуе спецыяльныя падраздзяленні для выканання службовых абавязкаў. Калі казаць пра пэўныя тэндэнцыі, то памылка многіх людзей у тым, што падчас надзвычайных сітуацый яны не ведаюць, што рабіць першапачаткова. І гэта не абавязкова могуць быць ваенныя дзеянні. Па статыстыцы, прыкладна 70% пацярпелых гінуць ад крывацёкаў: тыя, хто знаходзіцца побач, нясвоечасова аказваюць дапамогу або ўвогуле не ўмеюць гэтага рабіць.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Па ўмовах арганізатараў, у спаборніцтвах удзельнічаюць тыя, хто раней да такіх мерапрыемстваў не прыцягваўся. А ўсё дзеля таго, каб ахапіць як мага большую колькасць людзей, якія змогуць прыйсці на дапамогу ў экстрэмальнай сітуацыі.

Як падзяліўся камандзір групы атрада міліцыі асаблівага прызначэння УУС Брэсцкага аблвыканкама Яўген, для яго каманды гэты вопыт надзвычай карысны. «Каб правільна аказаць медыцынскую дапамогу, неабавязкова ўдзельнічаць у пэўнай баявой аперацыі, — тлумачыць Яўген. — Падобны вопыт можа нам спатрэбіцца і па-за службай: рэгулярна мы становімся сведкамі дарожна-транспартных здарэнняў, надзвычайныя сітуацыі могуць адбыцца ў нашых дварах і, не дай бог, у сем'ях. І незалежна ад таго, хто ты па прафесіі — міліцыянер, токар, прыбіральшчыца або ўрач — кожны з нас павінен умець дзейнічаць у падобнай сітуацыі».

Курсанты 3-га курса Ваеннай акадэміі Віталь Салдаценка і Максім Грыц згодны, што ніхто не застрахаваны ад надзвычайных сітуацый, таму важнасць своечасовага і правільнага аказання медыцынскай дапамогі з'яўляецца надзвычай актуальнай. Атрыманым падчас спаборніцтваў вопытам юнакі абавязкова падзеляцца са сваімі таварышамі.

Застаецца спадзявацца, што гэтыя веды спатрэбяцца юнакам менавіта ў такіх мэтах, а за экстрэмальнымі сітуацыямі мы будзем сачыць толькі ў перыёдыцы і на тэлевізійных экранах.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*